# ПРАВА НА ВЫКАРЫСТАННЕ ВЫЯВЫ ГРАМАДЗЯН У БЕЛАРУСКІМ МЕДЫЯРЭГУЛЯВАННІ

***В. А. Зразікава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zrazikova@tut.by*

У артыкуле разгледжана выкарыстанне і ахова выявы грамадзян у заканадаўчых дакументах Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з нормамі прававога рэгулявання прааналізаваны парадак выкарыстання і распаўсюджвання выяў асоб у СМІ.

***Ключавыя словы:*** заканадаўства; СМІ; медыярэгуляванне; права; Рэспубліка Беларусь.

# THE RIGHT TO USE IMAGES OF CITIZENS IN THE BELARUSIAN MEDIA REGULATION

***V. A. Zrazikova***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. A. Zrazikova (Zrazikova@tut.by)*

The article deals with the use and protection of the image of citizens in the legislative documents of the Republic of Belarus. In accordance with the norms of legal regulation, the procedure for using and distributing images of people in the media is analyzed.

***Key words:*** legislation; media; media regulation; right; tht Republic of Belarus.

Пытанні прававога медыярэгулявання набываюць асаблівую актуальнасць. Журналісты штодзённа ўступаюць у прававадносіны, звязаныя з атрыманнем, зборам і распаўсюджваннем інфармацыі. Задача журналістаў – інфармаваць грамадства, якое найперш і зацікаўлена ў аб'ектыўнай, дакладнай і праўдзівай інфармацыі.

Заканадаўчая рэгламентацыя правоў журналістаў у Рэспубліцы Беларусь (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Закон аб СМІ, міжнародныя дамовы) з'яўляецца прыярытэтным напрамкам развіцця

інфармацыйнага грамадства, адной з умоў бяспекі і стабільнасці краіны ў сферы інфармацыі і камунікацыі. Любыя ненарматыўныя дзеянні вядуць да суб’ектыўнай ацэнкі ролі журналістаў, ігнаравання пастулатаў Канстытуцыі рэспублікі і міжнародных стандартаў.

Каб пазбегнуць прафесійных рызык, журналісты павінны добра ведаць свае правы. Да аднаго з вострых пытанняў, што не мае ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь дакладнага вырашэння і патрабуе тлумачэння, належыць рэгуляванне адносін у галіне выкарыстання выявы грамадзян. Узнікае шмат пытанняў: ці можна свабодна выкарыстоўваць выявы іншых асоб і размяшчаць іх у СМІ, інтэрнэце? У якіх выпадках неабходна атрымліваць згоду ад грамадзян на такое выкарыстанне?

У беларускім заканадаўстве не вызначаны прававы статус выявы грамадзян, адсутнічае адназначная судовая практыка і няма адзінства думак сярод навукоўцаў і практыкаў. З аднаго боку, распаўсюджванне выяў грамадзян без іх згоды праз медыя можа парушаць (і часта парушае) правы і законныя інтарэсы грамадзян, бо з’яўляецца ўмяшальніцтвам у іх прыватнае жыццё, супярэчыць праву на асабістую тайну. З другога ж боку, умовы аб магчымым выкарыстанні выявы фізічнай асобы толькі з яе згоды прама не прапісаныя ў Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь.

Калі апублікаваная без згоды грамадзяніна выява не парушае яго асабістыя немаёмасныя правы і адлюстроўвае дакладную інфармацыю, прававая норма захаваная. У адваротным выпадку грамадзянін можа абараняць сваё права на выяву грамадзянскімі спосабамі: забарона на выкарыстанне выявы, выдаленне з інтэрнэту, кампенсацыя маральнай шкоды. Так, у выпадку абнародавання матэрыялаў са скажэннем выявы можна гаварыць аб парушэнні права на абарону гонару і годнасці, у выпадку тайнага здымка – права на асабістую тайну.

Асобна па пытанні прававой аховы выявы грамадзян неабходна адзначыць пазіцыю Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь (Рашэнне ад 30.10.2018 № Р-1145/2018). Суд канстатуе, што права на ахову грамадзян з’яўляецца неад’емным асабістым немаёмасным правам кожнага, і ўзнімае пытанне аб неабходнасці далейшай распрацоўкі механізмаў абароны такога права ў дзейным заканадаўстве з улікам забеспячэння гарантый, прадугледжаных артыкуламі 28 і 59 Канстытуцыі (незаконнае ўмяшальніцтва ў асабістае жыццё) [1].

Такі падыход узяты беларускімі заканадаўцамі за аснову распрацоўкі Праекта да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, што плануецца

дапоўніць арт. 153-1: абнародаванне і выкарыстанне выяў грамадзян дапускаецца толькі з іх згоды. У якасці выключэння прадугледжаны два выпадкі: выкарыстанне выявы ў дзяржаўных і грамадскіх інтарэсах; выкарыстанне выявы, атрыманай пры здымках у адкрытых для свабоднага наведвання месцах ці на публічных мерапрыемствах. Звяртаем увагу, што інтэрнэт не адносіцца да адкрытых для свабоднага наведвання месцаў. Акрамя гэтага, на фотаздымак з выявай чалавека распаўсюджваюцца яшчэ і аўтарскія правы на фатаграфію, хаця само па сабе права фізічнай асобы на выяву не з'яўляецца аўтарскім правам і не належыць фатографу. Калі ўзяць без дазволу фота з інтэрнэту, можна адначасова парушыць і права чалавека на выяву, і аўтарскія правы фатографа, які зрабіў гэты здымак [2].

Грамадскі савет пры Міністэрстве ўнутраных спраў лічыць неабходным не толькі забяспечыць права грамадзян на абарону ад незаконнага ўмяшальніцтва ў іх асабістае жыцце, але і забараніць без згоды выкарыстоўваць выявы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў МУС пры выкананні імі службовых абавязкаў [1].

Акрамя Грамадзянскага кодэкса, выкарыстанне выявы грамадзян у медыя рэгулюецца нормамі іншых заканадаўчых актаў. Так, у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе» не дапускаецца выкарыстанне выяў ці выказванняў грамадзян Рэспублікі Беларусь без іх згоды ці згоды іх законных прадстаўнікоў (пункт 10 арт. 9).

Пункт 4 арт. 34 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» прадугледжвае абавязак журналістаў СМІ атрымліваць згоду фізічнай асобы на відэазапіс, кіна- і фотаздымкі, за выключэннем іх правядзення ў месцах, адкрытых для масавага наведвання, а таксама выпадках, прадугледжаных арт. 40 Закона. У адпаведнасці з ім вышэйназваныя матэрыялы дазваляецца распаўсюджваць без згоды фізічнай асобы, калі былі прынятыя меры супраць ідэнтыфікацыі гэтай асобы іншымі асобамі, а таксама пры ўмове, што распаўсюджванне гэтых матэрыялаў не парушае канстытуцыйных правоў і свабод асобы і неабходна для абароны грамадскіх інтарэсаў, за выключэннем выпадкаў распаўсюджвання такіх матэрыялаў па запатрабаванні органаў крымінальнага праследавання, суда ў сувязі з вытворчасцю папярэдняга расследавання, судовымі разбіральніцтвамі.

Асаблівы рэжым выкарыстання выяў дзейнічае ў адносінах да непаўналетніх: згода можа быць атрымана ад законных прадстаўнікоў,

бацькоў альбо апекуноў, ці ад саміх непаўналетніх (у залежнасці ад узросту). Пры гэтым згода не патрабуецца ў выпадках, адзначаных раней (пункт 4 арт. 34 Закона аб СМІ): у месцах, адкрытых для масавага наведвання, і на масавых мерапрыемствах.

Калі звярнуцца да замежнага вопыту, то ў Еўропе з 25 мая 2018 года дзейнічае забарона на фатаграфаванне асоб без атрымання прамой згоды (выключэнне – фота, што не дазваляюць ідэнтыфікаваць канкрэтнага чалавека: размытыя фота, сілуэты прахожых). У расійскай практыцы выява грамадзян адносіцца да інфармацыі аб персанальных звестках: атрымліваць згоду не патрабуецца, калі апрацоўка персанальных звестак ажыццяўляецца ў грамадскіх інтарэсах, для законнай дзейнасці зарэгістраваных СМІ (на блогераў ці іншых асоб гэта не распаўсюджваецца).

Права чалавека на ўласную выяву належыць да ліку нематэрыяльных даброт і павінна абараняцца поруч з іншымі немаёмаснымі правамі (гонар і годнасць, дзелавая рэпутацыя, асабістая недатыкальнасць, тайна асабістага і сямейнага жыцця). У беларускім заканадаўстве пытанне аб выкарыстанні выявы грамадзян іншымі асобамі патрабуе ліквідавання нявызначанасці ў прававым рэгуляванні адносін. Неабходна знайсці баланс паміж правам на свабоду выражэння адных і правам на асабістае жыццё іншых. Што датычыцца дзейнасці журналістаў, то пазбегнуць прававой калізіі дапамагае Закон аб СМІ, дзе прапісаны выпадкі свабоднага і абмежаванага выкарыстання выяў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 30 октября 2018 г. № Р-1145/2018 «О правовом регулировании в гражданском законодательстве использования и охраны изображения гражданина» [Электронный ресурс]. URL: https://pravo.by/upload/docs/op/K91801145_1541192400.pdf (дата обращения: 03.09.2020).
2. *Зразікава В. А.* Фатаграфія як аб'ект аўтарскага права (на прыкладзе інтэрнэт-СМІ) // Журналістыка-2016: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 18-й Міжнар. навук.-прак. канф., прысвечанай 95-годдзю БДУ (10–11 ліст. 2016 г., Мінск) / БДУ, Інстытут журналістыкі; рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 18. Мінск : БДУ, 2016. С. 452–455.